✓У выдавецтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пабачыла свет унікальнае выданне – манаграфія **«Гісторыя беларускай нацыянальнай бібліяграфіі. 1921 – 2021»**. Гэта вынік плённай навуковай дзейнасці Таццяны Кузьмініч, кандыдата педагагічных навук, дацэнта, аўтара навуковых, вучэбных і метадычных прац па тэорыі і гісторыі беларускай бібліяграфіі, фарміраванні бібліятэчных фондаў, стварэнні інфармацыйнай прадукцыі, інфармацыйнай культуры асобы. Грунтоўная




навуковая праца ў комплексе дэманструе розныя аспекты развіцця беларускай нацыянальнай бібліяграфіі на працягу апошняга стагоддзя. Даследаванне спрыяе фарміраванню новых навуковых ведаў у межах айчыннага бібліяграфазнаўства, навукова-інфармацыйнаму забеспячэнню адукацыйнай практыкі. Выданне будзе карысным не толькі для спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, але і для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй беларускай нацыянальнай бібліяграфіі.